# КУЛЬТУРОЛОГИЯ

УДК 316.77:008

## КОЛЬКАСНАЯ І ЯКАСНАЯ МЕТАДАЛОГІЯ ДЛЯ ДАСЛЕДАВАННЯ КУЛЬТУРНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ: МАГЧЫМАСЦІ І АБМЕЖАВАННІ

*А.Д. КРЫВАЛАП*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*Разглядаюцца магчымасці якаснай і колькаснай метадалогіі для даследавання культурнай ідэнтычнасці, асабліва ў тых выпадках, калі колькасная метадалогія не можа забяспечыць неабходны эўрыстычны патэнцыял. Аналізуюцца паспяхова завершаныя даследаванні ў сферы культурнай ідэнтычнасці на беларускім эмпірычным матэрыяле (С. Барысаў, Л. Навуменка, М. Рогава, С. Ушакін, А. Шэлест). Падкрэсліваюцца станоўчыя наступствы спалучэння метадаў для дасягнення больш глыбокіх вынікаў; абгрунтавана легітымнасць выкарыстання якаснай метадалогіі для вырашэння звязаных з культурнай ідэнтычнасцю пытанняў.*

**Ключавыя словы:** *якасная метадалогія, практыка, колькасная метадалогія, культурная ідэнтычнасць.*

**Уводзіны.** Пад час абмеркавання актуальных даследчых пытанняў шмат увагі надаецца зместу і аргументацыі, а сродкі і метады, якімі гэтыя аргументы былі атрыманы, могуць быць пакінуты ў цені. Адным з такіх пытанняў з'яўляецца праблема ідэнтычнасці, якая па-ранейшаму застаецца актуальнай для культуралагічных даследаванняў. У свой час П. Бурдзьё пераканаўча патлумачыў, чаму не існуе грамадскай думкі «ў тым сэнсе, які ўтоена надаецца ёй тымі, хто займаецца апытаннямі, або тымі, хто выкарыстоўвае іх вынікі, толькі гэта, удакладняю, грамадская думка не існуе» [2, с. 177]. Па аналогіі з гэтым можна паспрабаваць паказаць абмежаванасць магчымасцей колькаснай метадалогіі вымярэння ідэнтычнасці ў грамадстве. Недастаткова наўпрост запытацца, да каго вы сябе адносіце, таму што неабходна таксама зразумець, што гэта значыць для рэспандэнтаў і якім чынам іх штодзённыя практыкі залежаць ад гэтага.

*Мэта* артыкула – акрэсліць магчымасці выкарыстання якаснай метадалогія для даследавання праблемы ідэнтычнасці ў тых выпадках, калі колькасная метадалогія не можа забяспечыць неабходны эўрыстычны патэнцыял.

**Асноўная частка.** Існуе цэлы шэраг даследаванняў праблемы ідэнтычнасці ў беларускім грамадстве, але звычайна гэта робіцца пераважна колькаснымі метадамі. У першую чаргу тут неабходна адзначыць разнастайныя маніторынгі грамадскай думкі Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Так, пад час гэтых даследаванняў рэспандэнтам было прапанавана выказаць сваё стаўленне (пагадзіцца ці адмовіцца) да пэўных сцвярджэнняў, звязаных з атаясамліваннем сябе з той ці іншай супольнасцю, сацыяльнай роляй і інш. Пасля гэтага атрыманыя вынікі ў адпаведнасці з аналітычнымі працэсамі колькаснай метадалогіі потым канвертавалася ў адсоткі для зручнасці параўнання і далейшай візуалізацыі. На падставе атрыманых дадзеных Л. Навуменка сфармулявала «праблему беларускай ідэнтычнасці, якая складаецца са станаўлення і захавання нацыянальнай ідэнтычнасці ва ўмовах сучасных глабалізацыйных працэсаў» [8, с. 173], а таксама прапанавала тэарэтычную схему для вывучэння беларускай ідэнтычнасці, якая прадугледжвае вымярэнні на індывідуальным і групавым узроўні. «Сутнасць беларускай ідэнтычнасці раскрываецца ў пачуццях прыналежнасці і адданасці людзей сваёй краіне Беларусі, дачынення да яе жыцця; еднасці з яе народам, яго культурай і гісторыяй. У якасці базавых кампанентаў беларускай ідэнтычнасці варта вылучыць такія яе складнікі, як тэрытарыяльную, грамадзянскую, этнічную і культурную субідэнтычнасці» [8, с. 179].

Пры гэтым праблема ідэнтычнасці разглядаецца з дапамогай оптыкі розных дысцыплін: псіхалогіі, сацыялогіі, культуралогіі і іншых, кожная з якіх імкнецца патлумачыць працэс канструявання ідэнтычнасці ў адпаведнасці з уласным тэрміналагічным апаратам і тэарэтычнымі падыходамі. Для псіхааналітычнай традыцыі ідэнтыфікацыя можа разглядацца і як працэс, і як яго вынік: «Станаўленне і развіццё ідэнтычнасці заключаецца ў сінтэзе ідэнтыфікацый, якія інтэгруюцца ў сістэму складнікаў кампанентаў цэльнай ідэнтычнасці» [3, с. 28]. Расце колькасць публікацый, якія прысвечаны не ідэнтычнасці ў шырокім сэнсе, а яе розным праявам, падзяляючы этнічную, нацыянальную і культурную ідэнтычнасці,

што толькі падкрэслівае складанасць і шматмернасць беларускай ідэнтычнасці. І ў той жа час, «спецыфіка беларускага кантэксту патрабуе выкарыстання ў даследаваннях найбольш адчувальных этнічных і культурных індыкатараў» [3, с. 45–46]. Фактычна, гэта можна інтэрпрэтаваць як пацвярджэнне абмежаваных магчымасцей колькаснай метадалогіі, якая па зразумелых працэдурных момантах проста фізічна не може быць максімальна гнуткай і адчувальнай да даследуемых пытанняў. Выснова, што «сярод базавых складнікаў беларускай ідэнтычнасці найбольш актуалізаваны (па змяншэнню) тэрытарыяльная, этнічная і грамадзянская, менш астатніх – культурная» [3, с. 82], зроблена на падставе колькасці адказаў на пытанне: ці згодны вы з выказваннем, што я прадстаўнік беларускай культуры? Зразумела, што гэта пытанне можа быць прачытана вельмі шырока. Бо што значыць быць прадстаўніком беларускай культуры, ці абавязкова для гэтага быць творцам культуры, ці дастаткова проста быць носьбітам і спажыўцом яе практык і традыцый? Адсутнасць падобных тлумачэнняў у колькасных апытаннях вядзе да таго, што «культурную субідэнтычнасць адрознівае ад іншых самая нізкая распаўсюджанасць і самая высокая няўзгодненасць ацэнак» [3, с. 83]. Атрымоўваецца, што колькаснымі метадамі магчыма зафіксаваць наяўнасць істотных адрозненняў у разуменні і інтэрпрэтацыі таго, што такое культурная ідэнтычнасць, а для таго, каб патлумачыць, чаму так адбываецца, узнікне патрэба ў якаснай метадалогіі. Л. Навуменка тлумачыць, што «гэта сведчыць пра мэтазгоднасць у далейшым пад час даследавання беларускай ідэнтычнасці выкарыстоўваць спалучэнні гэтых двух падыходаў пры прэваліраванні «якаснага» з іх» [3, с. 158].

Яшчэ адным прыкладам выкарыстання колькаснай метадалогіі (анкетанае апытанне) можа быць даследаванне «Сацыяльная база праграм трансфармацыі ў Беларусі», мэтай якога было «даць змястоўнае і колькаснае апісанне беларускага грамадства па крытэрыю адносін да інавацый і маштабу самавызначэння» [9, с. 6]. У выніку атрымалася шмат цікавых і нечаканых высноў, якія патрабуюць дадатковых тлумачэнняў: «Яшчэ менш зразумелая сітуацыя са структурай ідэнтычнасці» [9, с. 92], якая мае некалькі парадоксаў і негатыўных фактараў, што пагражаюць магчымым трансфармацыям, сярод якіх неабходна адзначыць рэнесанс савецкай ідэнтычнасці, адсутнасць публічнага абмеркавання наяўных праблем і непераадольныя перашкоды паміж грамадскімі актывістамі і шырокімі слаямі насельніцтва. Атрымоўваецца, што 25,6% апытаных адказалі, што часта адчуваюць еднасць з савецкім народам, такой «фантомнай супольнасцю, рэальнае існаванне якой засталося ў мінулым. Самаідэнтыфікацыя сябе ў якасці беларуса, што б ні стаяла за гэтым словам ва ўяўленні рэспандэнтаў, знаходзіцца на першым месцы па распаўсюджанасці, больш за тое, практычна не маем негатыўнай самаідэнтыфікацыі» [9, с. 37]. Ёсць нечаканыя вынікі, якія вельмі праблематычна патлумачыць з дапамогай колькаснай метадалогіі.

Іншымі словамі, колькасная метадалогія дазваляе зафіксаваць змяненне ў разуменні культурнай ідэнтычнасці, паказаць наяўнасць тэндэнцыі, але далей яе выкарыстанне не прыносіць плённых вынікаў і таму неабходна ўключаць кампанент якаснай метадалогіі. У задачы гэтага тэксту не ўваходзіць даказаць, які метад лепшы, а проста паказаць эфектыўнасць і магчымасці іх спалучэння.

Фактычна атрымаўшы легітымацыю выкарыстання якаснай метадалогіі ў вывучэнні адметнасці культурнай ідэнтычнасці, неабходна паказаць вядомыя прыклады выкарыстання падобнай метадалогіі. Ёсць некалькі паспяхова рэалізаваных даследчых праектаў, якія былі зроблены з выкарыстаннем якаснай метадалогіі, а не колькаснай, і прысвечаны праблеме культурнай ідэнтычнасці ў Беларусі.

Гэта два праекты С. Ушакіна, адзін з якіх «Наяўнасць без ідэнтыфікацыі» [5], які прысвечаны разгляду магчымасцей інтэрпрэтацыі фатаграфій савецкага перыяду ў гісторыі Беларусі ў кантэксце дыскурсу посткаланіяльных даследаванняў. Калі праз вельмі суб'ектыўны выбар аб'ектаў для аналізу магчыма пабудаваць цэльную сістэму інтэрпрэтацыі савецкага мінулага ў сённяшнім кантэксце. А другі, пра канструяванне ці вырошчванне ідэнтычнасці, калі няма неабходнасці выбіраць паміж канцэпцыямі з прыстаўкай пост, бо «ў гэтым выпадку: гэтыя дыскурсы постсацыялістычны і посткаланіяльны прысутнічаюць адначасова» [6, с. 430]. Тут ён фармулюе асноўнае правіла посткаланіяльнага падыходу да посткамунізму ў сучасных беларускіх умовах: «Заўсёды быць гатовым, каб вырасціць новае жыццё з “нічога”» [6, с. 474]. Можна сказаць, што гэта мае дачыненне і да бясконцага працэсу канструявання культурнай ідэнтычнасці як сацыяльнага станаўлення.

Яшчэ адным прыкладам даследавання, якое спалучае колькасныя і якасныя метады, будзе праект М. Рогавай «што кажуць беларусы, калі яны кажуць пра нацыянальную ідэнтычнасць» [7], які пабудаваны на выкарыстанні вынікаў правядзення некалькіх фокус-груп. Пры гэтым аналізуецца не столькі, што прамаўляюць удзельнікі фокус-груп, колькі тое, як яны выказваюцца: «Пры інтэрпрэтацыі дадзеных былі разгледжаны аспекты: 1) унутры групавая ідэнтыфікацыі; 2) унутры групавое аспрэчванне; 3) ідэальная адлегласць паміж групамі, што паказвае на ідэнтыфікацыю і / або канфлікт паміж групамі» [7, с. 648]. Тут якасная метадалогія дапамагае зразумець адрозненні ў камунікатыўных практыках, прысвечаных праблеме ідэнтычнасці прадстаўнікоў розных пакаленняў.

Асобнае месца сярод даследчых праектаў, прысвечаных спробам зразумець беларускую ідэнтычнасць займае манаграфія «Зразумець Беларусь: нататкі вандруючых сацыёлагаў» [1]. Кампазіцыйна тэкст манаграфіі стылізаваны пад карціну (першы план і фон, дакладная прапрацоўка значных дэталяў і размытасць і незавершанасць другасных, адсылкі да палатна і рамы як канцэптуальнага фрэйму і інш.). Праца над праектам цягнулася больш за год, непасрэдна ў Беларусі даследчыкі правялі 54 дні і ўзялі 44 інтэрв'ю. Потым «атрыманы ў выніку даследавання масіў транскрыбіраваных тэкстаў інтэрв'ю быў падвергнуты паліфактарнаму кантэнт-аналізу і шырока выкарыстоўваўся пры напісанні тэксту кнігі» [1, с. 16]. Аўтары актыўны выкарыстоўваюць метафары і параўнанні, каб паказаць усю разнастайнасць і шырыню магчымых інтэрпрэтацый беларускай ідэнтычнасці. «З Беларуссю ўсё так і не так. Па крайняй меры, патрапіўшы ў гэту краіну, хутка заўважаеш, што сутыкаешся з нейкім адметным тыпам монанацыянальнасці <...> Галоўнае адрозненне, паводле нашых назіранняў, у тым, што межнацыянальныя межы ў Беларусі часта праходзяць не паміж людзьмі, а ўнутры кожнага з іх» [1, с. 46]. Пры гэтым тэма посткаланіяльных даследаванняў памежжа як сацыяльна-культурнага феномену ў тэксце перыядычна выступае на першы план. «У выніку «беларускасць» аказваецца нібыта растворанай у людзях; <...> атрымоўваецца, што «беларускасць» – гэта не прыкмета для дакладнай фіксацыя нацыянальнай прыналежнасці канкрэтнага чалавека, колькі адзін з інгрыдыентаў яго асобы. Магчыма, па гэтаму нацыянальнае пачуццё беларусаў – роўнае, без вуглоў і выступаў. У яго кардыяграме няма ламаных пікаў ганарлівасці і самалюбства, але няма і цёмных правалаў, дрыгвы самапрыніжэння» [1, с. 47]. Вынікам зробленага даследавання таксама з'яўляецца магчымасць зрабіць прагноз і акрэсліць тэндэнцыі на бліжэйшы час: «Перспектыўны вектар гістарычнага руху краіны Беларусь, як нам уяўляецца, наступны: ад памежжа – праз самадастатковасць – да цэнтральнасці. Цэнтральнасць тут варта разумець не як імкненне быць ва ўсім лепшымі, а як здольнасць быць непаўторным, і ў сваёй непаўторнасці, унікальнасці, быць незаменным у агульным еўрапейскім доме» [1, с. 180]. Але гэты працэс нацыянальнага развіцця ў еўрапейскім кантэксце, на думку аўтараў, можа быць параўнаны з досведам сацыяльна-культурных трансфармацый Сінгапура, з тым толькі адрозненнем, што ў Беларусі яшчэ неабходна «знайсці тую культуру, якую яшчэ наканавана сканструяваць» [1, с. 210]. Можна выказаць здагадку, што пошук гэтай культуры будзе больш паспяховым, калі ён будзе суправаджацца даследаваннем адметнасцей культурнай ідэнтычнасці, каб было зразумела, што неабходна знайсці.

**Заключэнне.** Варта падвесці папярэднія вынікі тэарэтычнага параўнаўчага аналізу магчымасцей колькаснай і якаснай метадалогіі ў дачыненні да вывучэння праблемы культурнай ідэнтычнасці. Складанасць даследавання ідэнтычнасці можна параўнаць з цяжкасцямі вывучэння сістэмы каштоўнасцей: ёсць словы, а ёсць практыка, ёсць прыгожыя тлумачэнні, а ёсць не прыдатная да тлумачэння дзейнасць, сэнс якой у ёй самой. З культурнай ідэнтычнасцю такія ж самыя складанасці, можна праводзіць шматлікія колькасныя апытанні, якія будуць выяўляць пэўныя наяўныя тэндэнцыі, але будуць пазбаўлены магчымасці іх патлумачыць. А выкарыстанне якаснай метадалогіі, на падставе экспертных інтэрв'ю, без тысяч апытаных рэспандэнтаў, можа прапанаваць дастаткова пераканаўчую і праўдападобную версію тлумачэння чаму, і галоўнае, якім чынам гэта магчыма. «У рамках культурнай ідэнтычнасці канстытуіруючую функцыю маюць гістарычная памяць, ўяўленні пра мінулае, якія пацвярджаюць для чальцоў грамадства іх ідэнтычнасць і сімвалічна сцвярджаюць іх адзінства ў часе і прасторы дзякуючы агульнай гісторыі» [3, с. 156]. І гэты дынамічна зьмяняючыся праект культурнай ідэнтычнасці непазбежна ўключае ў сябе і практыку выкарыстання інтрэтнэт-тэхналогій. Калі «анлайн зараз з'яўляецца такой жа неад'емнай часткай штодзённай камунікацыі і самарэпрэзентацыі, як тэлефон ці тэлевізар, і неабходна адмовіцца ад ідэі вылучаць абасобленую «віртуальную» сферу» [4, с. 10] для разумення ідэнтычнасці. Пры напісанні гэтага тэксту не было мэты паказаць перавагу якасных метадаў над колькаснымі ці наадварот. Замест гэтага была прынята спроба разгледзець магчымасці спалучэння метадаў для дасягнення больш глыбокіх вынікаў. Была абгрунтавана легітымнасць выкарыстання якаснай метадалогію для вырашэння пытанняў, звязаных з культурнай ідэнтычнасцю. Выкарыстанне якаснай метадалогіі пашырае эўрыстычныя магчымасці для культуралагічных даследаванняў у сферы культурнай ідэнтычнасці.

ЛІТАРАТУРА


1. Борисов, С. Понять Беларусь: записки странствующих социологов / С. Борисов, Ю. Юшкова-Борисова, [б.м.]. – Издательские решения, 2018. – 210 с.
2. Бурдьё, П. Общественное мнение не существует : [пер. с фр.] / П. Бурдьё // Социология политики / сост., общ. ред. и предисл. Н.А. Шматко. – М. : Socio-Logos, 1993. – С. 159–177.
3. Науменко, Л.И. Белорусская идентичность. Содержание. Динамика. Социально-демографическая и региональная специфика / Л.И. Науменко. – Минск : Беларуская навука, 2012. – 205 с.
4. Miller, D. University College London. Future Identities: Changing identities in the UK – the next 10 years / D. Miller. – London, 2013. – 15 p.

5. Oushakine, S.A. Presence without Identification: Vicarious Photography and Postcolonial Figuration in Belarus / S.A. Oushakine // October. – 2018. – № 164. – С. 49–88.
6. Oushakine, S.A. How to Grow out of Nothing / S.A. Oushakine // Qui Parle. – 2018. – № 2 (26). – С. 423–490.
7. Rohava, M. Identity in an autocratic state or what belarusians talk about when they talk about national identity / M. Rohava // East European Politics and Societies. – 2018. – № 3 (32). – С. 639–668.
8. Науменко, Л.И. Белорусская идентичность. Концептуализация понятия / Л.І. Науменко // Социологический альманах. – 2010. – № 1. – С. 171–180.
9. Шелест, О. Социальная база программ трансформаций в Беларуси. Отчет по результатам исследования / О. Шелест. – Минск, 2017. – 154 с.

*Пастурiў 26.04.2019*

## QUANTITATIVE AND QUALITATIVE AND METHODOLOGIES FOR THE STUDY OF CULTURAL IDENTITY: POSSIBILITIES AND LIMITATIONS

***A. KRIVOLAP***

*The article considers the possibilities of qualitative and quantitative methodologies for the study of cultural identity. Especially in cases where the quantitative methodology cannot provide the necessary heuristic potential. In the article have presented successfully completed studies in the field of the cultural identity of the Belarusian empirical material (S. Borisov, L. Navumenka, M. Rohava, S. Oushakine, A. Shelest). This article does not attempt to decide which methodology is better but instead emphasizes the positive effects of a combination of methods to achieve more profound results. The article is the argument for the legitimization of the uses of the qualitative methodology to address issues related to cultural identity.*

***Keywords:*** *qualitative and quantitative methodologies, praxis, cultural identity.*